**Мацiеўскi, М.** Тых дарог забыць нельга / М. Мацiеўскi // Сцяг Iльiча (Талачын). – 2000. – 22 лiп. – С. 2.

## ТЫХ ДАРОГ ЗАБЫЦЬ НЕЛЬГА

Цiха войкнуў i ўпаў на камянi маёр – камандзiр часцi, закрычаў i тут жа сцiх хтосьцi з байцоў. Значыць, i яго напаткала куля душманаў. Яны ж вось, побач. Азвярэлыя ад нянавiсцi, са смертаноснай зброяй у руках. А яго аўтамат, як на тое лiха, адкацiўся пры рэзкiм штуршку машыны ўбок. Ды i пакуль развернешся для стральбы…

I тады камандзiр IМР сяржант Лепяшынскi «кiнуў» паслухмяную яго рукам шматтонную махiну прама на ворагаў. Скрыгатнулi гусенiцы, заглушыўшы дзiкi, пранiзлiвы' крык i... наступiла цiшыня.

– Некалькi душманаўя знiшчыў тады, а астатнiя здалiся.

У голасе Васiля Лепяшынскага адчуваецца горыч. Па ўсяму бачна, што яму не вельмi даспадобы гэтыя ўспамiны. Але затым голас яго робiцца жорсткiм, у iм гучыць ужо нянавiсць:

– Мы не крыважэрныя, але, якуспомнiш загiнуўшых баявых сяброў там, у Афганiстане, дзяцей-калек, з якiм садызмам здзекавалiся душманы над старымi i жанчынамi, дык, паверце, кроў стыне ў жылах, хочацца зноў ораць у рукi зброю i бiць iх, нiшчыць, як шалёных сабак.

Мой субяседнiк змаўкае, пэўна, пад уплывам гневу i болю, якiя ахапiлi яго. Толькi жаўлакi ходзяць па яго шчаках ды усё сцiскаюцца i сцiскаюцца рукi ў кулакi. Рукi, якiя калiсьцi трымалi школьныя падручнiкi i якiя падносiлi мацi-даярцы ў дзень яе нараджэння палявыя кветкi, якiя паспелi ўжо ў дзяцiнстве патрымацца за руль аўтамашыны бацькi-шафёра i за рычагi трактара брата-механiзатара...

Калi ж спатрэбiлася, Васiль Лепяшынскi ўзяў у рукi зброю. Ён, як i iншыя маладыя байцы, выконваў свой iнтэрнацыянальны абавязак у саставе абмежаванага кантынгенту савецкiх войск у Афганiстане.

Былы воiн-iнтэрнацыяналiст... Так называюць цяпер Васiля Лепяшынскага. Ён ведае, як свiшчуць кулi, калi прыцэльна б'е вораг. Ён ратаваў ад смерцi таварышаў i, здаралася, не паспяваў iх уратаваць...

Мы сядзiм з Васiлём ля шматпавярховага дома ў Коханаве. Цвiце лета, i цiха стаяць аблiтыя сонейкам зялёныя шаты дрэў. Чысты блакiт неба над намi, i не верыцца, што дзесьцi грымяць выстралы, iльецца кроў, з перадсмяротным ускрыкам падаюць людзi.

– Я, калi вярнуўся з Афганiстана дадому, усё нiяк не мог прывыкнуць да цiшынi, – пасля працяглай паўзы падаў, урэшце, голас Лепяшынскi. – Усё мне здавалася, што вось зараз адкуль-небудзь прагучыцьаўтаматная цi кулямётная чарга, i ты павiнен быць гатовым у любое iмгненне даць адпор ворагу...

Ен зноу змаўкае i ўтароплiвае позiрк кудысьцi удалячынь, пэўна, у думках пераносячыся праз далi-дальнiя туды, дзе быў на жорсткай вайне.

– Разумееш, там, у Афганiстане, кожны з нашых байцоў лiтаральна на кожным кроку рызыкаваў сваiм жыццём, – зноў падау голас Васiль. – I ў любую секунду мы былi гатовыя ўступiць у схватку з ворагам. Гэтая гатоунасць была не часовым, а пастаянным нашым станам...

Калона аўтамашын з прадуктамі харчавання для жыхароў аддаленага кішлака выцягнулася амаль на кіламетр. Наперадзе яе ішла разведвальная машына, адразу ж за ёю – ІМР Васіля Лепяшынскага. Гэтая створаная на базе танка машына-бульдозер абавязана была расчышчаць завалы на шляху руху аўтакалоны. А іх шмат спецыяльна стваралі душманы. І за той жа вялікай колькасцю камянёў наладжвалі засады. Упаўне зразумелае іх жаданне знішчыць ІМР і тым самым спыніць аўтакалону, заманіць яе ў пастку.

Мінавалі карпусы старых будынкаў. Затым – нізкія глінабітныя разваліны ўбаку ад дарогі. Затым – апошнія адзінокія духаны. Неўзабаве пачалася няроўная даліна. І ўслед за тым аўтакалона амаль адразу аказалася ў гарах – у гарах вайны.

Пасур'ёзнелі твары байцоў, якія сядзелі ў кабінах побач з вадзіцелямі. Іх аўтамашыны былі напагатове.

Васіль Лепяшынскі насцярожана аглядваў праплываючыя побач скалы. І гэтакжа насцярожана аглядвалі іх астатнія байцы – нападзенне магло адбыцца ў любую секунду. І ў любую секунду яны былі гатовыя ўступіць у схватку з ворагам...

І яна адбылася. Жорсткая, як заўсёды, кровапралітная. Але духі адступілі перад мужнасцю нашых воінаў...

Васіль Лепяшынскі вярнуўся зтой далёкай, незразумелай вайны з медалём «За баявыя заслугі», які камандзір часці прымацаваў яму на гімнасцёрку напярэдадні дэмабілізацыі.

Стройным, падцягнутым, у ладна падагнанай вайсковай форме, з медалём на грудзях, і з'явіўся ён у Коханаве перад шчаслівымі бацькамі. Прыпала да шырокіх сынавых грудзей маці Тамара Васільеўна, моцна, па-мужчынску, абняў Васіля бацька Генадзь Сцяпанавіч – абодва тагачасныя працаўнікі калгаса імя Заслонава. Пачуўшы аб прыездзе Васіля, не стрымалася і прымчалася яго каханка Ірачка, цяпер ужо Ірына Аляксееўна, яго жонка, маці яго дзяцей.

Ён шмат чаго расказваў родным і блізкім, сябрам. Пра дарогі праз горныя цясніны, знявечаныя мінамі і фугасамі, па якіх яму часта даводзілася ездзіць на сваім ІМР і на якіх засады і абстрэлы былі звычайнай з'явай. Пра тое, як разам з афганскімі салдатамі яны ахоўвалі найбольш небяспечныя, а часта і смяротна небяспечныя, участкі дарогі. Пра гібель баявых таварышаў, суровы край, моцных і мужных людзей, якія марылі будаваць новае жыццё і на шляху якіх сталі душманы. І пра тое, што менавіта там, у Афганістане, пазнаў ён цану сапраўднай мужчынскай дружбы, адчуў усю меру адказнасці не толькі за лес Радзімы, але і лес яе сяброў. Паведаміў неяк, як у вольны час дапамагалі яны афганскім сялянам будаваць арыкі для арашэння зямель дэхканаў...

Васіль Лепяшынскі з гонарам выканаў свой інтэрнацыянальны абавязак. А сёння ён – адзін з лепшых рабочых Коханаўскага экскаватарнага завода. Выпрабаваны агнём душманаў, загартаваны у нялёгкім змаганні з ворагам, ён пасталеў душой, хоць сэрцам – такі ж палкі і няўрымслівы, як і раней, у юнацтве.

**Мікола Мацієўскі**